Падтрымай "Вясну" на PATREON

Рэха сакавіцкіх пратэстаў: пратаколы, суды, штрафы… дапоўнена

12.04.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Рыгор Крывіцкі ў судзе.

Суд Мазырскага раёна 11 красавіка разгледзеў адміністрацыйную справу рэгіянальнага каардынатара Руху "За Свабоду", пенсіянера **Рыгора Крывіцкага**. Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў акцыі пратэсту, што адбылася ў Мазыры 26 сакавіка.

Па інфармацыі праваабаронцы **Уладзіміра Целяпуна**, за паўгадзіннае абмеркаванне з іншымі жыхарамі Мазыра "дармаедскага" Дэкрэту, несправядлівай пенсійнай рэформы і нішчымных заробкаў суд вынес пастанову пакараць пенсіянера штрафам у памеры 20 базавых велічынь, альбо 460 рублёў.

У Віцебску завялі адміністрацыйную справу на мясцовага журналіста-фрылансера **Сяргея Русецкага**. 11 красавіка яго выклікалі ў Кастрычніцкі РАУС, правялі апытанне і склалі пратакол паводле артыкула 23.34 КаАП за нібыта ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве – мітынгу, які адбыўся ў абласным цэнты 25 сакавіка.

Таксама ў Віцебску суд Кастрычніцкага раёна завочна разгледзеў адміністрацыйнныя справы журналістаў **Вольгі Чайчыц** і **Андрэя Козела**, якіх затрымалі пад час Дня Волі 25 сакавіка. Суддзя **Уладзімер Царыкаў** вынес пастанову аб прыцягненні іх да адказнасці па арт. 22.9 КаАП - за працу без акрэдытацыі на замежныя СМІ.

Суд над праваабаронцам **Паўлам Левінавым** перанесены на 17 красавіка, паколькі Левінаў дагэтуль праходзіць курс лячэння курс ў кардыялягічным шпіталі, куды патрапіў адразу пасля затрымання 26 сакавіка.

Твитнуть







Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY